тывать: воспитательный потенциал обучения настолько велик, что с ним в условиях высшей школы не может соперничать никакое иное средство воспитания.

## КУЛЬТУРНАЯ ПАМЯЦЬ ЯК ЗАЛОГ ДУХОЎНАГА ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ АРХЕТЫПА СОНЦА)

*І.М.Малашук*
***Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт, Бабруйскі філіял***

Як паказвае міравы і айчынны вопыт, канкурэнтаздольнасць сучаснага спецыяліста залежыць не толькі ад валодання будучай спецыяльнасцю, а таксама залежыць ад яго культуры, духоўнага патэнцыялу і маральных арыентацый. Нішто так не ўплывае на фарміраванне асобы, яе духоўнае жыццё, як веданне культурнай спадчыны, народных звычаяў і абрадаў. Таму пры выкладанні культуралогіі, эстэтыкі даволі апраўданым з'яўляецца выкарыстанне лепшых духоўных здабыткаў нашага народа, нябесных і хтанічных архетыпаў. Менавіта ў іх адбілася духоўная практыка асэнсавання свету, прыроды і чалавека. Патрэбна адзначыць, што на генетычным узроўні існуе нябачная сувязь кожнага чалавека з першапродкамі, таму студэнты заўсёды з цікавасцю ставяцца да вывучэння тэм, звязаных са старажытнай культурай Беларусі і культурай роднага краю ўвогуле.

Адным з самых старажытных язычніцкіх культаў з'яўляецца салярны культ. Сонца было галоўным богам язычнікаў, яно лічылася пачаткам жыцця. Характэрнай асаблівасцю беларускіх народных вераванняў і абрадаў было своеасаблівае перапляценне хрысціянскай рэлігіі з больш старажытнымі аграрна-бытавымі вераваннямі ўсходніх славян. Асноўныя абрады беларусаў грунтаваліся вакол тых раней язычніцкіх свят, якія былі звязаны з важнейшымі гаспадарчымі цыкламі года.

Асаблівасці гаспадарчай дзейнасці прадвызначылі асновы фарміравання народнага светапогляду, у цэнтры якога была гарманічная ўзаемасувязь рэалій зямнога існавання з прыродна-касмічнымі працэсамі. Адносіны паміж Чалавекам, Прыродай і Космасам мелі і цяпер маюць усебаковы характар. "Чалавек з'явіўся на гэты свет, сфарміраваўся як найвышэйшая арганізаванасць, цвёрда стаў на ногі і шырока расправіў плечы менавіта ва ўлонні Маці-Прыроды, таму ён ніколі не спрабаваў вылучыць сябе, узвысіцца над светам жывёл і птушак, расліннасці і дрэў". З асаблівай павагай чалавек ставіўся да Сонца: яно давала жыццё ўсяму жывому на Зямлі.

Для вывучэння ранніх уяўленняў адносна ўтварэння і існавання Сусвету проста неабходна глыбіннае вывучэнне фальклору. Таму студэнты, дзеля таго каб спазнаць таямніцы старажытнага светасузірання, растлумачыць міфалагічную сімволіку, уявіць сабе ўзровень духоўнага развіцця першапродкаў, з павагай ставяцца да вывучэння вуснапаэтычных твораў як невычарпальнай крыніцы навуковага матэрыялу. Да ліку гэтых крыніц, асабліва каштоўных для навукі, адносяцца і многія звычаі, абрады і рытуалы, якія адлюстроўвалі ранейшыя касмалагічныя ўяўленні. "Пранікненне сонечнага культа ў светасузіранне народа станавілася тым глыбей, чым болей народ асвойваўся з мірнымі земляробчымі заняткамі і залежаў ад іх, а не ад вайны і рабаванняў". Салярны культ у найбольшай ступені знайшоў сваё адлюстраванне ў каляндарна-абрадавай паэзіі. Таму асаблівую зацікаўленасць выклікаюць Каляды і Купалле, якія звязаны з верхнім і ніжнім становішчам Сонца ў ходзе гадавога кругавароту. Студэнты імкнуцца пранікнуць у таямніцы традыцыйнага этнічнага светасузірання і ўслед за Сонцам раскрыць характар узаемаадносін паміж чалавекам-земляробам і наваколлем.

Несумненна, што ў фальклорным сінкрэтызме далёкага мінулага міфалагічныя ўяўленні адлюстроўвалі практычныя патрэбы чалавека, перш за ўсё гаспадарчыя, таму што ва ўлонні Прыроды-Маці ён павінен быў клапаціцца аб хлебе надзённым, аб самаахове, што было магчыма толькі ва ўмовах гарманічнага існавання ў наваколлі.

З усходам сонца заўсёды пачынаўся працоўны дзень селяніна:

Дабранач табе, шырокае поле,
Жыта ядраное.
На здароўе, жнеі маладыя,
Сярпы залатыя.
Прыходзьце заўтра раненька,
На ўсход сонейка....

Тая акалічнасць, што людзі працавалі да заходу сонца, таксама адзначаецца ў фальклоры: «Закаціся, жаркае сонейка, За шэры бор, А мы пойдзем вячэраці У багаты двор».

Нельга не пагадзіцца з А. Сержпутоўскім: “Сонейка ніколі не злуе, яно заўсёды ласкава пазірае ды хукае на ўсіх, як матка на сваіх дзетак”. Сонечнае цяпло і святло заўсёды ўяўлялі сабой каштоўнасць для земляроба: ад добрага надвор'я залежаў плён сялянскай працы. Жніўныя песні непасрэдна перадаюць атмасферу самай гарачай пары года ў жыцці сялянскай сям'і. Некаторыя з іх ўзніклі як закляцце для павелічэння ўраджаю. Напрыклад, песня "Радзі, сонца, жыта і пшаніцу". У яе тэксце чуваць маленне, звернутае, адпаведна язычніцкім вераванням, да найвялікшага, міласэрнейшага дараўніка цяпла - сонца, якое чалавек на пачатку цывілізацыі невыпадкова абагаўляў.

Земляробы імкнуліся ўміласцівіць сонца дзеля таго, каб яно засцерагала іх ўраджай і жывёлу, а значыць і жыццё. Адсюль і абагаўленне сонца, думка аб яго дабрыні і жыватворнасці. Аднак незаўсёды сонца прыносіць карысць, аб гэтым значна радзей гаворыцца ў вуснапаэтычнай творчасці: “А жаркае ж то сонца бярозу ўсушыла”; “Вецер коску развеець, слонца ліца загрэець”.

Сонца ў старажытнасці дапамагала чалавеку ва ўсіх справах, абараняла яго ад хваробы: “Мяне маці нарадзіла, сонейкам абгарадзіла”; “А я, раба божая (імя ), іду, сонцам асвячуся, месяцам абгараджуся. Іду, раба божая (імя), нікога не баюся”; “...Як месяц гасподні нараджаецца, жаркім сонцам агараджаецца, аградзі яе, Бог, ад усякіх злучаяў худых”.

Памяць людзей захавала безліч загадак, у якіх з найвышэйшым мастацкім густам апаэтызавана галоўнае нябеснае свяціла, прычым пераважная іх большасць яшчэ раз дае падставы меркаваць, што яно было галоўным боствам, якому пакланяліся нашы продкі, якое ўшаноўвалі ў шматлікіх абрадах: "Кругленька, бяленька ўсяму свету міленька", "Маленька, залаценька ўсё поле асвеціць".

Такім чынам, вышэйшая школа ў сучасных умовах павінна быць накіравана на комплексную рэалізацыю патрэб асобы ў інтэлектуальным, культурным і духоўным развіцці, і значнае месца павінна быць адведзена даследаванню першавытокаў, таму што без глыбокага і ўсебаковага вывучэння фальклорнай спадчыны мы не зможам зразумець касмічнага светаўспрымання нашых продкаў, не зможам аднавіць сувязь часоў і тым самым страцім сябе ў глыбіні стагоддзяў, не пакінем нашчадкам цікавыя змястоўныя здабыткі беларускай нацыянальнай культуры. Толькі на такой аснове можна выхаваць спецыяліста, які адпавядае высокім патрабаванням часу.